# АНТЫЯЎРЭЙСКІЯ ПАГРОМЫ НА ГОМЕЛЬШЧЫНЕ У 1917-22 г.г.

Н.В. Мінава

Пагромы яўрэйскага насельніцтва на Гомельшчыне ў перыяд 1917-22 г.г. былі арганізаваны і справакааны рознымі, пераважна антысавецкімі, сіламі, а менавіта: у 1917-19 г.г. ініцыятарамі пагромаў былі прадстаўнікі як мясцовага, так і немясцовага паходжання;у жніўні 1919 - ліпені 1920 г. адзначаны пагромы, якія былі арганізаваны польскімі акупацыйнымі войскамі; у лістападзе 1920 – студзені 1921 г. адзначаліся пагромы, якія арганізоўвалі ўзброеныя фармаванні Булак-Балаховіча; у 1921-22 г.г. пагромы, якія былі ўчынены прадстаўнікамі мясцовага насельніцтва, ці, па тэрміналогіі савецкіх органаў, мясцовымі бандамі.

З пагромаў 1917-19 г.г. асабліва вылучаецца пагром, які адбыўся ў Гомелі падчас, так званага «Стракапытаўскага» мецяжу 24-28 сакавіка 1919 г. У час пагрому адбываліся грабяжы і збіванні яўрэйскага насельніцтва. Было жортка забіта да 25 камуністаў, большасць якіх была яўрэйскай нацыянальнасці. Мяцеж чырвонаармейцаў Тульскай брыгады быў накіраваны супраць бальшавікоў, значную колькасць якіх складалі яўрэі, незадаволенне бальшавікамі было распаўсюджана на ўсё яўрэйскае насельніцтва.

Ад пагромаў, якія былі арганізаваны польскімі акупацыйнымі войскамі ў жніўні 1919-ліпені 1920 г., найбольш пацярпелі Мазырскі і Рэчыцкі паветы. Яўрэйскае насельніцтва вымушана было цярпець грабяжы і здзекі, прыцягвалася на прымусовую працу,адзначаліся забойствы яўрэяў. Агульную колькасць ахвяр польскага тэрору на Гомельшчыне з-за дрэннага захавання крыніц вызначыць складана. Захаваліся дадзеныя па асобным населеным пунктам: у Петрыкаве было забіта 6 яўрэяў, Мазыры-2, Калінкавічах-3, акрамя таго ў Мазырскім павеце было яшчэ забіта 12 яўрэяў. Матывацыя пагромаў была перад усім палітычнай:яўрэяў абвінавачвалі ў камунізме і шпіянажы.

Фармаванні Булак-Балаховіча на Гомельшчыне таксама арганізоўвалі пагромы, у час якіх яўрэйскае насельніцтва падвяргалася масавым грабяжам, здзекам і забойствам. У вёсках Бібяткі было забіта 19 яўрэяў (XI.1920), Міхедавічы-60 (XI.1920), Вялікія Гарадзяцічы-70 (26.XI.1920), Малыя Гарадзяцічы-10 (XI.1920) Мазырскага павета, у Калінкавічах-26 (1920), Хойніках-40 (1920). Усяго, па няпоўных дадзеных, балахоўцамі было забіта больш 246 яўрэяў. У дадзеным выпадку палітычныя прычыны пагромаў спалучаліся з жаданнем парабаваць. Пагромы 1921-22 г.г.былі арганізаваны групоўкамі мясцовага насельніцтва, пераважна суправаджаліся забойствамі яўрэяў. Так, у Ручаёўцы Рэчыцкага пав. было забіта 40 яўрэяў (7.II.1921), Васілевічах-9 (16.IV.1921), Капаткевічах-165 (10.VI.1921). Усяго, па няпоўных дадзеных, было забіта больш 400 яўрэяў. Асабліва жорсткімі былі пагромы груповак Галакі (Васільчыкава І.В.), што дзейнічалі тут з лютага па

ліпень 1921 г. Акрамя гэтых, дзейнічалі групоўкі Савіцкага, братоў Мядзведзявых, Мельнікава.

## ГОМЕЛЬСКАЕ ПАДНЯПРОУЕ У X-XIV СТ.

**І. Ермалаева**

Гісторыя Гомельскага Падняпроўя X-XIV ст. фрагментарна адлюстравана ў пісьмовых крыніцах, прыватна летапісных. У летапісах знаходзяцца першыя ўпамінанні аб гарадах, звязаныя з тымі або іншымі падзеямі гісторыі. Гомель упершыню трапляе на старонкі летапісу пад 1142г. у сувязі з тым, што смаленскі князь Расціслаў Мсціславіч здзейсніў паход на Чарнігаўскае княства, выкарыстаўшы барацьбу паміж нашчадкамі чарнігаўскага князя Алега Святаславіча і Манамахавічамі за вялікакняскі стол у Кіеве. 1142 г. лічыцца «зыходнай кропкай»гісторыі і Рагачова, у гэты час горад пераходзіць ва ўладанне ноўгарад-северскаму малодшаму князю Ігару. Упершыню Чачэрск упамінаецца ў летапісах пад 1159 г., калі кіеўскі князь Ізяслаў Давыдавіч вярнуў чарнігаўскаму князю Святаславу Ольгавічу Чачэрск,каб пазбегнуць усобіц. Летапісная гісторыя Рэчыцы пачынаецца з 1213 г. На выснове летапісных крыніц можна ўпэўнена лічыць Гомель, Чачэрск, Рэчыцу гарадамі Чарнігаўскай зямлі. Наконт Рагачова існуе два меркаванні: альбо прыналежыў да Тураўскай зямлі, альбо да Чарнігаўскай.

Верагодна, Гомель у 1160-х г.г. быў цэнтрам удзельнага княства, а таксама меў моцныя ўмацаванні. Аб гэтым сведчыць факт, што менавіта тут кіеўскі князь Ізяслаў Давыдавіч шукаў выратавання ў 1158 г. Відавочна, Гомель быў найбольш значным з шэрагу гэтых гарадоў у тыя гады.

Як бачна, на падставе пісьмовых крыніц нельга поўнасцю аднавіць карціну жыцця Гомельскага Падняпроўя. Менавіта таму,археалагічныя крыніцы дазваляюць сення праясніць многія пытанні, удакладніць вядомае. Напрыклад тое, што Гомель быў больш буйным населеным пунктам, падцвярджае ўстаноўленая плошча гомельскага гарадзішча, якая складала ў XII-XIII ст. не менш як 45-50 га (дзядзінец - 1,4 га), калі плошча гарадзішча ў Чачэрску дасягала каля 2,5 га (дзядзінец - 0,5 га), Рагачова - 1,1 га, а Рэчыцы-0,4 га (дзядзінец - 0,25 га).

Існуюць падзеі, якія ў пісьмовых крыніцах увогуле не адлюстраваны. Напрыклад тое, што Гомель быў спалены ў першай палове XIII ст. мангола-татарамі, аб гэтым сведчаць выяўленыя ў пласце пажару мангольскія наканечнікі стрэл. Археалагічныя крыніцы ўдакладняюць час узнікнення гарадоў гэтага рэгіена. Гомель узнік як горад у канцы X ст., гісторыя Рагачова пачынаецца раней летапіснай на с 100 год, а Рэчыцы-на 50-100.

Археалагічныя знаходкі даволі грунтоўна паведамляюць аб занятках рамеснікаў гарадоў Гомельскага Падняпроўя. Відавочна, што адной з самых распаўсюджаных груп гарадскіх майстроў былі кавалі. Таксама насельніцтва займалася ювелірна-бронзаліцейнай вытворчасцю,валодала прыемамі